УДК 331.105 (476)

# Тарыфная работа прафсаюзаў Беларусі ў перыяд новай эканамічнай палітыкі

Дубовік А.А.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Пры пераходзе да НЭПа адбывалася змяненне тарыфнай палітыкі, што праявілася ў паступовай ліквідацыі найбольш яркіх асаблівасцей аплаты працы перыяду “ваеннага камунізму” – ураўняльнасці і натуралізацыі. Нягледзячы на існаванне Наркамата працы, фактычна ўся тарыфная работа ў гэты час праводзілася тарыфна-эканамічнымі аддзеламі прафсаюзаў, з’яўлялася важнейшым накірункам іх дзейнасці. Можна выдзеліць некалькі яе этапаў. У ходзе першага этапа (1921–1925 гг.) пры пераводзе дзяржаўнай прамысловасці на гаспадарчы разлік адбылася частковая дэцэнтралізацыя тарыфна-эканамічнай работы. Асноўнай формай удзелу прафсаюзаў у рэгуляванні заработнай платы стаў калектыўны дагавор. На гэтым этапе прафсаюзы мелі найбольшую магчымасць рэалізаваць абарончую функцыю. У пошуках аптымальнага варыянту былі выкарыстаны розныя формы стымулявання працы рабочых: натуральнае прэміраванне, калектыўнае забеспячэнне, здзельшчына і інш. Да сярэдзіны 20-х гг. аплата працы на прамысловых прадпрыемствах складалася з натуральнага пайка (яго ўдзельная вага паступова змяншалася) і грашовых выплат (адпаведна ўзрасталі). Прафсаюзы даволі паспяхова спраўляліся з задачай рэгулявання заработнай платы, аднак рост яе ў некаторых галінах прамысловасці апярэджваў павышэнне прадукцыйнасці працы.

Другі этап (1926–1929 гг.) характарызаваўся барацьбой двух супрацьлеглых тэндэнцый: з аднаго боку, імкненнем галіновых прафсаюзаў да росту зарплаты, з другога – курсам партыйна-савецкага кіраўніцтва на інтэнсіфікацыю вытворчасці. У гэтай сувязі адбываецца паступовае адхіленне прафсаюзаў ад функцыі рэгулявання зарплаты праз калектыўныя дагаворы і тарыфныя пагадненні. У выніку абарончая функцыя прафсаюзаў звялася да ўраўняльнай палітыкі “падцягвання” адстаючых заробкаў рабочых цяжкіх галін індустрыі пры адначасовым стрымліванні росту аплаты працы ў рэнтабельных і найбольш развітых у БССР галінах перапрацоўчай прамысловасці. У ходзе тарыфнай рэформы 1928 г. прафсаюзы здалі свае пазіцыі па абароне эканамічных правоў работнікаў і павярнуліся “Тварам да вытворчасці” пры правядзенні рэжыму эканоміі; у прамысловасці быў ажыццёўлены пераход да прамога дзяржаўнага рэгулявання зарплаты. Тарыфная рэформа мела наступствам падзенне аўтарытэту і самастойнасці прафсаюзаў, а таксама зніжэнне рэальных заробкаў кваліфікаваных рабочых пры росце інтэнсіўнасці іх працы.